ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі
“Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы”

______________ Л.Ю. Паўлаў
“ 25 ” 02 2026 г.

# ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”
на дысертацыю Пышкала Кацярыны Рыгораўны
**“Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)”**, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Змест дысертацыі К.Р. Пышкала “Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)” адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне “гістарычныя навукі”, па якім дысертацыя прадстаўлена да абароны (вобласць даследавання: саслоўная палітыка, дзейнасць органаў кіравання, развіццё заканадаўства і судовай сістэмы, адносіны да асобных сацыяльных груп, дзейнасць інстытутаў апекі, грамадскіх арганізацый, паўсядзённасць, сямейныя адносіны, якія адпавядаюць пунктам 2, 5 пашпарта спецыяльнасці, зацверджанага загадам ВАК РБ ад 01.06.2022 № 180).

**Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці**

Навуковы ўклад саіскальніка грунтуецца на выяўленні, сістэматызацыі і аналізе невядомага раней фактгалагічнага матэрыялу, прысвечанага асаблівасцям функцыянавання органаў сацыяльнай апекі ва ўмовах новых палітычных падзей на працягу канца XVIII – першай паловы XIX ст. Упершыню ў навуковы абарот уведзены дакументы і матэрыялы фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (№№ 1284, 1287), 29 фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і 6 фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна, крытычна пераасэнсаваны навуковыя працы айчынных і замежных даследчыкаў. На гэтай падставе, з выкарыстаннем сучасных метадалагічных падыходаў дысертантам раскрыты адметныя рысы ў эвалюцыі заканадаўчых змяненняў, канфесійнай палітыкі (у дачыненні да праваслаўнага і ўніяцкага духавенства). Саіскальнікам

прааналізавана інстытуцыяналізацыя абароны правоў сірот дваранскага саслоўя, паказана спецыфіка дадзенага працэсу, працэдура і практычнае функцыянаванне дваранскіх апек. Асобнае месца адведзена апецы над сіротамі сельскіх і гарадскіх абывацеляў. Аўтарам выяўлены асаблівасці ажыццяўлення апекі з боку памешчыкаў і сельскай абшчыны.

Значнасць навуковага ўкладу саіскальніка ў вырашэнні пастаўленай мэты вызначаецца тым, што дысертацыя з'яўляецца першай у беларускай гістарыяграфіі навуковай работай, дзе вызначаецца спецыфіка функцыянавання саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

У дысертацыйным даследаванні К.Р. Пышкала ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі шляхам комплекснага аналізу асаблівасцей функцыянавання органаў апекі (дваранскіх апек і сіроцкіх судоў) атрыманы новыя навуковыя вынікі, якія спрыяюць усебаковаму асэнсаванню маладаследаваных бакоў жыцця насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў перыяд 1772–1861 гг.:

– вызначаны этапы развіцця заканадаўства, якія забяспечвалі правы дзяцей-сірот, а таксама рэгламент узяцця пад апеку на падставе Статута ВКЛ 1588 г. і акта "Учреждения для управления губерний Всероссийской империи" 1775 г.;

– выяўлены асаблівасці функцыянавання сіроцкіх судоў на падставе "Учреждений о губерниях" 1775 г. (I этап, II этап);

– паказана функцыянаванне апек над сіротамі дваранскага саслоўя;

– раскрыты генезіс прававога афармлення апекі праваслаўнай канфесіі ад асобных правіл аб спосабах уладкавання сірот да заснавання епархіяльных папячыцельстваў аб бедных духоўнага звання;

– паказаны асаблівасці заканадаўчага ўрэгулявання апекі над сіротамі ўніяцкага духавенства;

– праведзены аналіз аховы інтарэсаў сірот гарадскіх і сельскіх абывацеляў;

– выяўлены неінстытуцыяналізаваныя формы апекі над сіротамі духавенства і сельскіх абывацеляў у жыцці грамадства на падставе аналізу даных і асаблівасцяў функцыянавання апек і сіроцкіх судоў.

Навізна вынікаў не выклікае сумнення і абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі сістэмнага даследавання, самастойным прадметам якога была саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Высновы з'яўляюцца важнымі для далейшай навуковай распрацоўкі праблематыкі саслоўнай палітыкі царскага ўраду на беларускіх землях у 1772–1861 гг. і маюць практычнае значэнне ў навукова-педагагічнай дзейнасці, у сферы дзяржаўнага кіравання.

## Заўвагі па дысертацыі

У цэлым станоўча ацэньваючы разглядаемую дысертацыю, неабходна выказаць пэўныя заўвагі, якія носяць пераважна рэкамендацыйны характар.

1. У дысертацыі не ў поўнай меры раскрыты крыніцы фінансавання дзейнасці дваранскіх апек і сіроцкіх судоў.

2. На наш погляд, у дысертацыі адсутнічае класіфікацыя па асобным відам апек (над непаўналетнімі, над вар'ятамі, глуханямымі, нямымі).

3. Неабходна было звярнуць увагу на "спадчыннае" пытанне ў дачыненні да непаўналетніх жаночага полу па Статуту ВКЛ 1588 г. і агульнарасійскаму заканадаўству.

4. Аўтару неабходна было прааналізаваць не толькі "апякаемых" прадстаўнікоў іўдаізму, але і мусульманства.

Выказаныя заўвагі не мяняюць агульнай станоўчай ацэнкі дысертацыйнага даследавання і не зніжаюць яго навуковай і практычнай значнасці.

## Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе

Навуковая кваліфікацыя аўтара дысертацыі К.Р. Пышкала пацвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэферата, поўнасцю адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым навуковым даследаваннем, праведзеным на сучасным узроўні. Работа грунтуецца на рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчай базе, прадстаўленай дакументальнымі матэрыяламі, выяўленымі аўтарам у трох архівах Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама крыніцамі заканадаўчага характару. Бібліяграфічны спіс складае 324 пазіцыі. Крыніцы інтэрпрэтаваны з выкарыстаннем разнастайных метадаў гістарычнага даследавання, што павялічвае верагоднасць атрыманых вынікаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 13 навуковых работах, з якіх 4 – артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных ВАК РБ у пералік выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (агульны аб'ём 3,6 аўтарскіх аркуша), 4 артыкулы ў зборніках навуковых работ, 5 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены на 14 навукова-практычных канферэнцыях у Рэспубліцы Беларусь. Аўтарэферат дысертацыі і публікацыі цалкам адпавядаюць зместу дысертацыі і адлюстроўваюць навуковую навізну, практычную значнасць, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Высновы абгрунтаваны, пацвярджаюцца дадзенымі даследавання, адпавядаюць пастаўленым мэце і задачам, утрымліваюць у сабе новую навуковую інфармацыю.

**Канкрэтныя рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі асобных даследчыцкіх праблем, навукова-тэарэтычнага асэнсавання пытанняў развіцця палітычных, эканамічных і культурных працэсаў у Беларусі ў апошняй трэці XVIII – першай палове XIX ст., для падрыхтоўкі абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні ў ВНУ такіх вучэбных дысцыплін як "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Гісторыя Беларусі ў новы час", "Гісторыя дзяржавы і права Беларусі", "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі", "Гісторыя саслоўяў". Матэрыялы даследавання могуць быць карысны пры стварэнні музейных экспазіцый, выстаў, пры падрыхтоўцы навукова-папулярных твораў, дакументальных фільмаў. Матэрыялы дысертацыйнай працы ўкаранены ў практычную дзейнасць аддзела навуковай творчасці ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі» пры правядзенні гарадскога конкурса па гісторыі «XIX век: время перемен» для вучняў 8-х класаў (акт укаранення ад 19.12.2025 № 1).

**Заключэнне**

Дысертацыя Кацярыны Рыгораўны Пышкала "Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)" з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай працай, поўнасцю адпавядае пп. 19–21 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за раскрыццё асаблівасцей функцыянавання саслоўнай апекі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 г., што ўключае ў сябе:

1. вызначэнне асаблівасцей дзейнасці органаў сацыяльнай апекі і прававога статуса асобных саслоўяў на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.), дзе ў параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі захоўвалася функцыянаванне Статута ВКЛ 1588 г.;
2. характарыстыку механізму і кантролю, якія ажыццяўляліся праз органы павятовых і сіроцкіх судоў, дваранскіх апек;
3. вылучэнне фактараў, якія ўплывалі на апеку над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў, у тым ліку маёмасна-цэнтрычны прынцып апекі, этнаканфесійную спецыфіку сіроцкіх судоў;
4. вызначэнне асаблівасцей апекі над дзецьмі-сіротамі ў саслоўі духавенства, якая рэгулявалася ў межах царкоўных інстанцый па шляху карпаратыўнай адказнасці, у тым ліку і праз папячыцельствы аб бедных духоўнага звання;
5. выяўленне характэрных рыс апекі над дзецьмі-сіротамі з саслоўя сельскіх абывацеляў.

Водзыў на дысертацыю Кацярыны Рыгораўны Пышкала "Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)", якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па

спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, згодна з загадам прарэктара па вучэбнай рабоце ГрДУ імя Янкі Купалы ад 12.02.2026 № 96 разгледжаны на навуковым семінары “Актуальныя праблемы гістарычнай навукі” факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму (пратакол пасяджэння ад 25.02.2026 № 1).

К.Р. Пышкала выступіла на семінары з дакладам. У парадку навуковай дыскусіі саіскальнік адказала на ўсе пытанні прысутных.

У працы семінара прынялі ўдзел 13 членаў семінара з 16, у тым ліку 5 дактароў (В.А. Белазаровіч, Т.Т. Кручкоўскі, А.М. Нечухрын, С.А. Піваварчык, Э.С. Ярмусік) і 6 кандыдатаў гістарычных навук (С.У. Амелька, А.К. Гецэвіч, А.С. Горны, А.М. Загідулін, А.І. Мялешка, Н.Л. Улейчык), кандыдат філасофскіх навук (І.А. Змітровіч), кандыдат культуралогіі (С.У. Данскіх).

Вынікі адкрытага галасавання: “за” – 13; “супраць” – няма, “устрымаліся” – няма.

Кіраўнік навуковага семінара:
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі,
археалогіі і спецыяльных гістарычных
дысцыплін ГрДУ імя Янкі Купалы — С.А. Піваварчык

Эксперт апаніруючай арганізацыі:
кандыдат гістарычных навук, загадчык
кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін — С.У. Амелька
ГрДУ імя Янкі Купалы

Сакратар навуковага семінара:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
намеснік дэкана факультэта гісторыі,
камунікацыі і турызма
ГрДУ імя Янкі Купалы — Н.Л. Улейчык

ПОДПИСИ УДОСТОВЕРЯЮ:
Заместитель начальника
отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет
имени Янки Купалы»
О.И. Цуйчик
25 02 2026 г